средства, боролся за преобразования в жизни учебного заведения. Он активно вмешивался во все сферы жизни семинарии: в кадровую политику, экономику, строительство, дисциплину, досконально при каждом посещении проверял знания учащихся. Таким образом, и вклад его в становление учебного заведения, являющегося предшественником нынешней Витебской духовной семинарии, весьма значителен.

### Источники и литература

1. Богородский, Н.Н. Историческая записка о состоянии Витебской духовной семинарии за минувшее столетие ее существования (февраль 1807 – февраль 1907) / Н.Н. Богородский // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1907. – № 6. – С. 214–225. – № 7. – С. 245–254.

2. Витебская духовная семинария (1806.16.XII–1906 г.): заметки и воспоминания / собрал Дм. Ив. Довгялло. – Витебск : Губернская типолитография, 1907. – 84 с.

3. Иосиф (Семашко), митрополит. Записки Иосифа митрополита Литовского, изданные Императорскою Академией Наук по завещанию автора: в 3 т. – Санкт-петербург : Типография императорской академии наук, 1883. – 758 с.

4. Полное собрание законов Российской империи. 1806 года декабря 16. Указ Именной данный сенату «О назначении Полоцкого Софийского монастыря местом Епархиальной семинарии, соборного штата и Консистории». – Режим доступа: http://nlr.ru/e-res/law_r/search.php. – Дата доступа: 20.02.2018.





## МІТРАПАЛІТ ІОСІФ (СЯМАШКА) І ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯТЫНІ

*Драздова З.У.*
*(Мінск, Беларусь)*

Жыццё мітрапаліта Літоўскага і Віленскага Іосіфа (Сямашка) – прыклад мужнага, самаахвярнага, можна нават сказаць, апостальскага служэння Праваслаўнай Царкве, беларускаму народу. Тры тамы яго “Запісак”, перавыдадзеныя ў гэтым годзе ў Мінску, уяўляюць сабой багаты, унікальны матэрыял па царкоўнай гісторыі, гісторыі ўз’яднання беларускіх уніятаў з Праваслаўнай Царквой і разам з тым ствараюць яркі партрэт самога вялікага падзвіжніка, аўтара мемуараў, духоўнай сілай, вытрымкай, мужнасцю і розумам якога нельга не захапляцца. “Запіскі” мітрапаліта Іосіфа дазваляюць адчуць увесь цяжар архіерэйскага крыжа, зразумець маштабнасць яго дзейнасці, клопатаў аб вялікім і малым у жыцці хрысціяніна. Кніга аснашчана мноствам праўдзівых дакументаў, якія аб’ёмам перавышаюць успаміны, паводле заўвагі протаіерэя Аляксандра Раманчука, у сем разоў. Рэлігійнае, канфесійнае жыццё на беларускіх землях паўстае ў гэтых дакументах і ўспамінах досыць выразна, жыва.

Галоўнае, чым кіраваўся ў сваіх адносінах да людзей мітрапаліт Іосіф, – гэта любоў. У змешчаным у другім томе “Запісак” чацвёртым слове, прамоўленым 8 мая 1845 г. перад усяночнай напярэдадні свята святіцеля цудатворца Мікалая, з нагоды перамяшчэння ў Вільню Літоўскага епархіяльнага кіравання і адкрыцця кафедральнага, Мікалаеўскага сабора, ён гаварыў: “Так, Праваслаўныя, адна толькі любоў можа прынесці асалоду ўсяму, што ёсць цяжкага, у непахіснасці нашага абавязку, пры сённяшнім няшчасным раз’яднанні Царквы Хрыстовай. Любоў даруе памылку, стараючыся яе рассеяць. Любоў адхіліць пярэчанне, ахвяруючы сваім самалюбствам хвілінnай слабасці бліжняга. < > Любоў перанясе скрухі і напасці,

дзеля ўратавання сабрацій, якія памыляюцца. Любоў пераможа нянавісць, робячы дабро і тым, хто нас ненавідзіць. Любоў знішчыць неўразуменне, якое ўносіць непрымірымы разлад, нелады, і, можа быць, злучыць у адно тое, што мы з горыччу сэрца бачым раздзеленым адвечнымі памылкамі і страсцямі" [1, с. 752].

Мала каму з сённяшніх праваслаўных хрысціян Беларусі вядома, з якой любоўю клапаціўся мітрапаліт літоўскі Іосіф аб мошчах першых святых Віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія, што прынялі пакутніцкую смерць ад язычнікаў у Вільні ў 1347 г. пры вялікім князю Альгердзе (1296–1377), пры двары якога яны служылі. Літоўскія родныя браты Іаан і Антоній і іх сваяк Яўстафій сваім цвёрдым вызнаннем веры ў Хрыста і мучаніцкім спачынам многа садзейнічалі распаўсюджванню праваслаўнай веры. Праслаўленне святых мучанікаў адбылося ў хуткім часе пасля іх смяротнага пакарання. У кнізе "Святыя зямлі беларускай" (Мн., 2012) паведамляецца, што гэта адбылося паміж 1354 і 1374 гг. ў Канстанцінопалі. "Урачысты акт кананізацыі, – сцвярджаецца там, – здзейсніў Патрыярх Канстанцінопальскі Філафей, што было падзеяй неардынарнай, бо паводле існуючай традыцыі святыя кананізаваліся мітрапалітам Кіеўскім альбо ўшаноўваліся мясцова" [2, с. 59].

Праўда, у кнізе А. Яскевіч "Падзвіжнікі і іх святыні" (Мн., 2001) сустракаем іншае меркаванне. Даследчыца даводзіць, што "мітрапаліту Кіпрыяну [Кіеўскаму] належыць гонар кананізацыі віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана, Яўстафія (дзень памяці – 14/27 красавіка н.ст.). Першая служба ў гонар віленскіх мучанікаў, – зазначае А. Яскевіч, – адбылася ў 1431 г. ў капліцы над Вострай Брамай прад Віленска-Вострабрамскай іконай Божай Маці, якая належыць да тыпу "Нявеста Ненявестная" [3, с. 140].

Царква Святой Троіцы ў Вільні, дзе спачывалі мошчы святых мучанікаў, у 1609 г. была захоплена ўніятамі. У 1655 г. мошчы святых Антонія, Іаана і Яўстафія былі перанесены праваслаўнымі і





схаваны ў пячоры над галоўным алтаром Свята-Духава манастыра. І захоўваліся іх нятленныя целы ў драўлянай грабніцы, вырабленай, паводле падання, з таго самага, на думку язычнікаў "свяшчэннага", дуба, на якім былі павешаны.

У 1849 г. мітрапаліт Іосіф, усведамляючы важнасць праслаўлення Віленскай святыні, пачынае руплівую працу ў гэтым кірунку. Знайшоўшы нязручным для спуску ўваход у склеп з мошчамі віленскіх першамучанікаў, які знаходзіўся перад самымі царскімі варотамі, так што нават абцяжарвалася самое богаслужэнне, ён зрабіў яго зручным і прыгожым, уладкаваў да новага ўваходу жалезныя дзверы і рашоткі, аздобіўшы і сам склеп.

З дазвола Свяцейшага Сінода мітрапаліт Іосіф стварае ў 1851 г. ў пячоры алтар і іканастас і ператварае месца спачыну святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія ў цудоўную царкву, асвечаную ў іх гонар. Над дзвярыма ў пячору была павешана новая ікона святых. У лісце да І.Г. Сенявіна 26 лістапада 1850 г. архіерэй выказваў задавальненне напісанай іконай: "Цяпер-то нашы ўгоднікі Божыя прыбраліся на славу. Сапраўды, і жывапіс і разная рама цудоўныя – на іх бы заглядзеліся і ў сталіцах, не тое, што ў нас, на правінцыі" [1, с. 439]. Стараннем рэўнаснага пастыра і на ахвяраванні вернікаў да дню памяці святых 14/27 красавіка 1852 г. была выраблена і новая бронзавая пазалочаная рака, у якую пераклалі святыя мошчы да агульнага задавальнення Віленскага праваслаўнага статку. Шчаслівы быў і сам натхняльнік гэтага здзяйснення, якое лічыў вельмі патрэбным, што добра відаць з яго ліста да графа Пратасава ад 14 красавіка 1851 г.: "Прызнаюся, – зазначаў ён, – у апошнія чатыры месяцы мне б вельмі цяжка было памерці, не скончыўшы гэтай добрай справы – а справу гэту, у плане Праваслаўнай Царквы знаходжу я настолькі карыснай, што лічыў бы заслужыўшымся ў яе нават тады, калі б нічога больш не зрабіў для яе ў Вільні" [1, с. 442].

У гэтай уладкаванай і асвечанай ім жа царкве мітрапаліт Іосіф (Сямашка) пажадаў у глыбіні зямлі, пад ракаю святых мучанікаў

Антонія, Іаана і Яўстафія зрабіць сабе труну і пакрыць яе чыгуннай памятнай плітой, на якой было б напісана: Свяціцель Іосіф.

У сваіх "Словах" мітрапаліт Іосіф нагадвае сваёй пастве аб адзінстве Царквы зямной і нябеснай, аб законе адзінства чалавечага роду. Аб тым, што святыя хадайнічаюць за сваіх нашчадкаў, дапамагаюць іх уратаванню. "Не забывайце яшчэ, – Праваслаўныя, што Бог, не без асаблівай мэты, захаваў мошчы святых Віленскіх мучанікаў, на межах Царквы Праваслаўнай і святой Русі. Ён даў нам у іх скінію Запавету, вакол якой павінны мы стаяць у гэтай краіне, як вакол непарушнай цвярдыні; даў нам у іх пуцяводны стоўп, якога мы павінны трымацца, па шляху, зусім не небяспечным, зусім не пазбаўленым спакус. Гэта скінія Запавету, гэты стоўп пуцяводны, пастаўлены паміж намі, як бы для таго, каб аддзяліць авечак ад казлішчаў, і паказаць нам хоць часткова, каго Хрыстос Збаўца *выбраў і прыняў*, як сапраўдных сыноў Царквы Праваслаўныя, якой ён Стваральнік і ўстанаўленне" [1, с. 770].

Руплівы пастар справядліва адзначаў у сваіх "Словах", што храм Святога Духа са сваім манастыром, адзін са шматлікіх праваслаўных храмаў Вільні ўстаяў у Праваслаўі, толькі таму, што "заснаваны быў самой справаю на святых пакутніках", што святыя мошчы літоўскіх першапакутнікаў "не без асаблівай мэты з'явіліся светла менавіта тады, калі Праваслаўе ўваскрэсла ў Літве і яе некалі стольным горадзе Вільні, калі дзеці Праваслаўнай Царквы, так доўга для яе чужыя, вярнуліся ва ўлонне яе" [1, с. 764].

Мітрапаліта Іосіфа засмучала чужасць хрысціянскага насельніцтва па царкоўнаму адзінству. Але ў яго сэрцы не было варожасці да іншаверных. Паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца адносіны віленскага пастыра да факта прысваення рымска-каталіцкімі манахамі кармелітамі рускай праваслаўнай святыні – Вострабрамскай іконы Божай Маці, якая заўсёды знаходзілася, як на варце, над брамаю Вільні. "Мы не думаем патрабаваць назад





свяшчэнную Вострабрамскую ікону – наадварот, рады, што да гэтай рускай святыні звяртаецца з глыбокай пашанай у смутку і хваробах сваіх хрысціянскае насельніцтва горада Вільні, – хай згадаюць толькі, што і яны калісьці не былі чужыя ні Расіі, ні Царкве Праваслаўнай" [1, с. 789], – тлумачыў ён сваю пазіцыю праваслаўным, заклікаючы да міру і спагады да тых, хто заблудзіўся і страціў правільныя арыенціры.

"Виленский вестник" (18 красавіка 1852 г.), а пасля "Северная Пчела" (2 мая 1852 г.) паведамлялі аб ахвяраванні высокапраасвяшчэнным мітрапалітам Іосіфам Віленскаму Святадухаву манастыру непарушнага капіталу ў тры тысячы рублёў срэбрам, з тым, каб працэнты з яго былі раздзелены на тры роўныя часткі і былі выкарыстаны: "на незгасальную лампаду каля труны святых мучанікаў, на манастырскую брацію, якая адпраўляе тут набажэнства, і на раздачу бедным незалежна ад веравызнання, і звыш таго з тым, каб кожны год, у суботу першага тыдня вялікага посту, каля мошчаў святых мучанікаў адпраўлялася ўрачыстая літургія з паніхідаю за ўсіх удзельнікаў у выратавальнай справе ўз'яднання Уніятаў з Праваслаўнай Царквою" [1, с. 773].

Мітрапаліт Іосіф неаднаразова нагадваў сваёй пастве, што імкненне да дасканаласці – самая галоўная запаведзь нябеснага нашага Адкупіцеля, свяшчэнная мэта жыцця хрысціяніна. І ён сам быў узорам сапраўднага пастыра для верных – *словам, жыціем, любоўю, духам, вераю, чысцінёю*.

**Літаратура і крыніцы**

1 Иосиф, митрополит Литовский. Записки Иосифа митрополита Литовского [Сканированный Интернет текст] / Митрополит Литовский Иосиф: изданныя Императорскою Академіею наукъ, по завѣщанию автора – Том II, Санктпетербургъ: типографія Императорской Академіи наукъ – 1883. – 786 с.

2 Святыя зямлі беларускай [Тэкст] / Жыццяпісанні – Мінск. Прыход Свята – Петра-Паўлаўскага сабора – 2012 – 184 с.

3 Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі [Тэкст] / Алена Яскевіч – Мінск : Полымя – 2001. – 368 с.

## ПОЛОЦКАЯ ПРАВОСЛАВНАЯ ЕПАРХИЯ: АКТУАЛИЗАЦИЯ ЯЗЫКА ПРОПОВЕДИ В ПРОЦЕССЕ ВОССОЕДИНЕНИЯ С УНИАТАМИ

*Теплова В.А.*
*(Минск, Беларусь)*

Последствием Полоцкого церковного собора явился непростой путь возвращения сотен тысяч униатов белорусских земель к практике православной жизни. Более чем 200-летнее пребывание православных в составе греко-католической церкви оставило заметный след в сознании верующих. Известно, что униатская церковь в первой трети XIX в. в своей обрядности имела черты, скорее западной христианской традиции, нежели восточной. Многие бывшие униаты после 1839 г., формально считавшиеся православными, по разным причинам посещали костелы, исповедовались у ксендзов, т.е. являлись католиками на практике [1]. Даже спустя четверть века после Полоцкого собора чиновники, приезжавшие с проверкой в белорусские губернии, свидетельствовали о том, что православное население древнейшей православной кафедры не оставило старых униатских привычек.

В ходе процесса воссоединения правящим архиереем Полоцкой епархии в 1838 г. был назначен епископ Василий (Лужинский). Владыка хорошо знал все особенности вверенной ему епархии: широкое распространение польского языка среди привилегированного сословия, недоброжелательное отношение к православию чиновничества, богатство ксендзов и унизительная бедность православных священников, величественный вид костелов и разрушающиеся, ветхие православные храмы, безграмотное простонародье, молящееся на польском языке [2]. Епископ понимал, что уничтожить расхождения в совершении обрядов между вновь воссоединенными и древлеправославными сразу нельзя, поэтому полагал лучшим способом искоренения униатских традиций обучение детей прихожан в церковно-приходских школах. «Самый коренной вопрос в жизни белорусского народа, – писал епископ, – это вопрос об открытии сельских училищ при церквях. Беларусь в течение веков подвергалась влиянию иезуитской цивилизации через Полоцкую иезуитскую коллегию. Можно только через школы привести белорусский народ к сознательному пониманию православной веры доблестных своих предков» [3]. Епископ был уверен, что учащиеся, молясь «по славянски», постепенно обучат молитвам и родителей, пробудят у них интерес к православию. Понимая, что римскую веру поддерживает польская элита, архиепископ Василий обращал внимание на возвращение полоцко-витебскому краю разговорного белорусского языка посредством проповедей и поучений пастве «на родном языке».

Этому способствовала и политика правительства императора Николая I, направленная на деполонизацию белорусских губерний [4], одним из результатов которой стало исключение из программ образования в Белорусском учебном округе польского языка и очищение греко-католической церкви от латинизмов. Началом реализации новой политики стал указ российского императора от 9 октября 1827 г. который предписывал «принимать в базилианские монастыри униатов, хорошо знающих славянский язык и чин греко-восточного богослужения», а «при совершении богослужения и прочих священных обрядов не употреблять иного языка, кроме природного, свойственного унии церковнославянского, в проповедях и в обучении закону